# СЕМАНТЫЧНАЕ ПОЛЕ "КРОЎ" У СВЯТЛЕ АСАЦЫЯТЫЎНАЙ ЛЕКСІКАГРАФІІ

## Валько М. А.

Гродненский государственный медицинский университет

Научный руководитель: Варанец В. І.

**Актуальность.** Адным з перспектыўных напрамкаў як у філалагічных, так і ў звязаных з філалогіяй даследаваннях з'яўляецца асацыятыўная лексікаграфія. На стыку філалогіі і медыцыны яна дазваляе, апроч іншага, выяўляць словы-рызыкі – словы, здольныя паводле розных тэорый псіхасаматыкі змяняць фізіялагічны статус чалавека [1]. У якасці прыкладаў слоў, здольных выклікаць у пацыентаў пачуццё страху і трывогі, можна прывесці кампаненты семантычнага поля "кроў".

**Цель.** Шляхам аналізу наяўнай літаратуры па тэме медыцынскай асацыятыўнай лексікаграфіі выявіць словы, якія адносяцца да семантычнага поля "кроў", а таксама выявіць словы-трыгеры, у адказ на якія ўзнікаюць кампаненты гэтага поля.

**Методы исследования.** У ходзе даследавання выкарыстоўваўся "Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі" (Варанец В. І., Валько М. А., 2022) [2]. Рабіўся дэталёвы аналіз прадстаўленых у слоўніку сабраных асацыятыўных палёў з мэтай выяўлення слоў, якія адносяцца да семантычнага поля "кроў". Па заканчэнні аналізу праводзілася сістэматызацыя даных па прынцыпе высвятлення слоў-трыгераў, якія выклікалі сярод асацыяцый той ці іншы кампанент разглядаемага семантычнага поля.

**Результаты и их обсуждение.** Па выніках праведзенага аналізу "Асацыятыўнага слоўніка медыцынскай лексікі" было выяўлена 13 лексічных адзінак, якія адносяцца да семантычнага поля "кроў": "кроў", "аналіз крыві", "застылая кроў", "кроў з носа", "страта крыві", "у крыві", "кровазварот", "крываўка", "крывацёк", "анемія", "крывяносны", "крывяны", "крывяносная сістэма".

Да лексічнай адзінкі "кроў" было выяўлена 40 слоў-трыгераў. Да лексічных адзінак "аналіз крыві", "страта крыві", "кровазварот", "крывацёк", "анемія" і "крывяносная сістэма" – па 2 словы-трыгеры. Астатнія кампаненты разглядемага лексічнага поля былі выяўлены як асацыяцыі да адзінкавых слоў-трыгераў.

Пры гэтым толькі да трох кампанентаў семантычнага поля кроў: "кроў", "кровазварот" і "крывацёк" – былі выяўлены словы-трыгеры, у асацыятыўных палях да якіх доля разглядаемых слоў-рызыкаў склала больш за 5%. Асацыяцыя кроў узнікала ў 5 і больш працэнтах выпадкаў да слоў "донар" (66,50) (тут і далей у дужках – доля разгляданай лексічнай адзінкі ў асацыятыўным полі да



Репозиторий ГрГМУ

названага слова-трыгера ў працэнтах, %), "згусанне" (43,50), "халестэрын" (38,50), "тромб" (30,00), "сэрца" (13,50), "слупняк" (13,00), "пластыр" (10,50), "рана" (9,00), "недакроўнасць" (8,00), "ціск" (7 ,00), "нашча" (6,00), "хвароба" (5,00).

Асацыяцыя "кровазварот" склала больш за 5% у асацыятыўным полі да слова "згушчэнне" (8,00% ад усяго асацыятыўнага поля). Асацыяцыя "крывацёк" – таксама да слова "згушчэнне" (16,00% ад усяго асацыятыўнага поля).

**Выводы.** Такім чынам, можна казаць, што семантычнае поле "кроў" прадстаўлена досыць шырока ў асацыяцыях да лексічных адзінак, якія адносяцца да медыцынскай лексікі, аб чым сведчыць колькасць выяўленых кампанентаў (13). Дадзеная акалічнасць сведчыць аб неабходнасці большай акцэнтуалізацыі ўвагі медыцынскіх працаўнікоў ва ўжыванні як саміх слоў лексічнага поля "кроў", так і слоў, якія выклікаюць у пацыентаў асацыяцыі з дадзенага поля.

У той жа час факт, што толькі 3 з 13 выяўленых кампанентаў разглядаемага поля – "кроў", "кровазварот" і "крывацёк" – займалі ў шэрагу асацыятыўных палёў больш за 5% ад усіх асацыяцый, дазваляе дэталізаваць далейшыя даследаванні як у пошуку слоў-рызыкаў у прыватнасці, так і прафесійнай асацыятыўнай лексікаграфіі ўвогуле.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Карвасарский, Б. Д. Клиническая психология : учебник для ВУЗ / под ред. Б. Д. Карвасарского. – СПб: Питер, 2010. – 864 с.
2. Варанец, В. І. Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі / В. І. Варанец, М. А. Валько. – Гродна: ГрДМУ, 2022. – 94 с.

# ДИНАМИКА КОЭФФИЦИЕНТА ВЫНОСЛИВОСТИ КВААСА У ВОЕННОСЛУЖАЩИХ ПО ПРИЗЫВУ В ЗАВИСИМОСТИ ОТ ПРЕОБЛАДАНИЯ ВЕГЕТАТИВНОГО ТОНУСА В ТЕЧЕНИЕ 6 МЕСЯЦЕВ ВОЕННОЙ СЛУЖБЫ

## Василевич Н. С.

Гродненский государственный медицинский университет

Научный руководитель: Князев И. Н.

**Актуальность.** Ежегодно тысячи юношей призываются на срочную военную службу с различными психологическими особенностями и физической подготовленностью. После призыва на военную службу юношам предстоит адаптироваться к новым условия военной службы, отличным от их гражданской

Репозиторий ГрГМУ